Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 34 (54) Пятніца, 24 жніўня 1945 г. Цана 15 кап.

## СЯЎБА АЗІМЫХ

Працоўнае сялянства нашага раёна паспяхова закончыла ўборку зернавых культур. Зараз ідзе напружаная работа па абмалоту і здачы хлеба дзяржаве.

Аднак на раду з хлебанарыхтоўкамі надыходзіць новая важная кампанія—сяўба азімых культур. Гэта кампанія патрабуе вялікай арганізаванасці і ўмення ў яе правядзенні. Лёс будучага ўраджаю азімых будзе залежыць ад таго, як партыйныя, савецкія, комсамольскія арганізацыі арганізуюць правядзенне сяўбы, ад разумення сваіх задач кожным сялянінам, кожнай сялянкій.

Пагэтаму трэба ўжо зараз весці работу на сяле, мабілізуючы сялян на своечасовую і добраякасную сяўбу азімых, разбіваючы думку асобных сялян аб тым, што сяўбу азімых пачынаць яшчэ рана. Вялікая задача ў гэтай галасці ўскладаецца на сельскіх агітатараў і сельскі актыў.

Вопыт паказаў, што там дзе жыта было пасеяна ў тэрмін, атрыман добры ўраджай. Наадварот, позні пасеў даў нізкі ўраджай.

На сяўбе азімых, як і ў вясеннюю пасяўную кампанію, трэба арганізаваць шырокую ўзаемадапамогу бясконным гаспадаркам з тым, каб ні адзін гектар азімага кліна не астаўся не засеяным.

Задача кожнага сяляніна і сялянкі своечасова падрыхтавацца і правесці сяўбу азімых у лепшыя тэрміны на добра апрацаванай і ўгноенай глебе.

## Лепшыя хлебаздатчыкі

Першымі выканалі свае абавязацельствы па хлебаздачы ў Стайкаўскім сельсовеце сяляне Раманчук Пётр, Раманчук Сідар, Шамерай Сямён (в. Стайкі), Белая Надзя (в. Міхнавічы), Кавальчук Іван (в. Алексейкі), др. Яны з'яўляюцца лепшымі хлебаздатчыкамі.

ДАТЭРМІНОВА РАЗЛІЧЫМСЯ З ДЗЯРЖАВАЙ ПА ХЛЕБАНАРЫХТОЎКАХ

## ЗВАРОТ

### СЯЛЯН І СЯЛЯНАК В. ЯБЛОНКА ЯБЛОНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА ДА УСІХ СЯЛЯН І СЯЛЯНАК РАЁНА

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Атрымаўшы перамогу над гітлераўскай Германіяй савецкі народ прыступіў да аднаўлення разрушанай нямецка-фашысцкімі захопнікамі народнай гаспадаркі.

Совецкае сялянства, унёсшае вялікую лепту ў агульную справу перамогі над ворагам, з а р а з прыкладае ўсе намаганні, к а б хутчэй залячыць раны, нанесеныя сельскай гаспадарцы вайной.

Нямецкія грабілы спалілі нашу вёску, угналі жывёлу, многа н а ш ы х аднасяльчан расстралялі, увезлі ў рабства. Але фашысцкія палачы не зламалі наш дух.

Наша вёска актыўна дапамагала партызанам у іх барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Лепшыя людзі вёскі змагаліся ў радах партызанскіх атрадаў супроць нямецкіх ізвергаў.

Цяпер, калі гітлераўская Германія пераможана і павергнута ў прах, калі дабіваецца апошні фашысцкі агрэсар на Усходзе—Японія, мы у с ю сваю работу падначалілі інтарэсам яшчэ большага ўмацавання ваеннай і эканамічнай магутнасці нашай Радзімы.

Дзякуючы высокай арганізаванасці і ўзаемадапамогі мы паспяхова правялі веснавую сяўбу і дабіліся добрага ўраджаю.

Прыступаючы к уборачнай кампаніі мы ўзялі абавязацельства хутка і без страт убраць і датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па хлебанарыхтоўках з ураджаю 1945 г.

Сваё абавязацельства мы выканалі. Да 15 жніўня наша вёска поўнасцю разлічылася з дзяржавай па здачы хлеба. Абавязуемся да 15 верасня поўнасцю выканаць план здачы дзяржаве малака, мяса і шэрсці.

Таварышы Сяляне і сялянкі! Мы заклікаем вас паследаваць нашаму прыкладу ў датэрміновым выкананні хлебанарыхтовак і прадуктаў жывёлагадоўлі.

Хлеб трэба нашай дзяржаве, нашай Чырвонай Арміі, нашаму рабочаму класу. Хлеб трэба для хутчэйшага разгрома апошняга ачага агрэсіі—Японскага імперыялізма, для аднаўлення народнай гаспадаркі нашай Радзімы. Больш хлеба—б л і ж э й перамога. Больш хлеба—яшчэ больш багатая і моцная наша дзяржава.

Няхай жыве наша соцыялістычная Радзіма!

Няхай жыве наша гераічная Чырвоная Армія—пераможца!

Няхай жыве вялікі правадыр і настаўнік Генералісімус Сталін!

Па даручэнню схода падпісалі: Барсук, старшыня Выканкома сельсовета; Баран А. і Міхнікевіч Е., упаўнаважаныя сельсовета; сяляне: Кулініч А. І, Пытляк Е. О., Зыбайла Пётр, Янушкевіч К. В., Янушкевіч С. Е., Міхнікевіч Л. І. Санчукоўская С. Г., Баран Л. І., Ялоўская Д. М., Пытляк П., Цытляк А. Е., Кулініч, Лаўрэнчык.

## РАЁННАЯ ДОШКА ПАЧОТА

Рашэннем Выканкома райсовета дэпутатаў працоўных і Райкома КП(б) Беларусі ад 21 жніўня г.г. на Раённую Дошку Пачота заносіцца:

Вёска ГАЛЫНКА Бусяжскага сельсовета (упаўнаважаны сельсовета ў вёсцы т. КАСПАРОВІЧ), сяляне і сялянкі якой датэрмінова выканалі план хлебанарыхтовак на 100 процантаў.

## У Выканкоме райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б) Беларусі

Выканком райсовета дэпутатаў працоўных і райком партыі абмеркавалі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж сельскімі советамі раёна па выкананню плана хлебанарыхтовак на 20 жніўня г.г.

Пераходны Чырвоны Сцяг райвыканкома і райкома КП(б)Б астаўлен у Грыўдзенскім сельсовеце (старшыня сельсовета т. Крокас), які другую пяцідзёнку трымае першынство ў раёне і на 20 жніўня выканаў план хлебанарыхтоўкі на 45 проц.

Выканком райсовета і райком КП(б) Б адзначылі добрую работу ў справе хлебанарыхтовак Івацавіцкага пасялковага совета (старшыня выканкома т. Рэкіш), Яблонскага сельсовета (старшыня Выканкома т. Барсук) і Жытлінскага сельсовета (старшыня Выканкома сельсовета т. Колтун).

Аначасова Выканком райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б адзначылі нездавальняючую работу ў справе кіраўніцтва хлебанарыхтоўкамі з боку Выканкомаў Альшаніцкага, Косаўскага і Альбінскага сельсоветаў, дзе план хлебаздачы выканан на 6-10 працэнтаў.

Райвыканком і райком партыі адобрылі зварот сялян і сялянак в. Яблонка, Яблонскага сельсовета да ўсіх сялян і сялянак раёна за датэрміновае выкананне хлебанарыхтовак і прапанавалі старшыням Выканкомаў сельскіх советаў абмеркаваць зварот на агульных сходах сялян у кожным населеным пункце і разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновую здачу хлеба дзяржаве.

## НЕ ЗАБЫВАЦЬ АБ СУПРОЦЬПАЖАРНОЙ АХОВЕ

Супроцьпажарная ахова ў летні перыяд набывае важнае значэнне. Ад малейшай неасцярожнасці з агнём населены пункт можа пацярпець вялікае бедства.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на дзяцей. Рад выпадкаў узнікнення пажараў у раёне выкліканы з прычыны неасцярожнага абыходжання дзяцей з агнём. Пагэтаму трэба прыняць неабходныя меры, каб дзеці не мелі доступу к запалкам і другім рачам, якімі можна запаліць.

Неабходна таксама прыняць належныя меры для ачысткі населеных пунктаў ад сухога мусару і саломы. Кожны сялянскі двор павінен утрымлівацца ва ўзорным супроцьпажарным парадку.

Важная задача начальнікаў пажарных дружын і ўсяго насельніцтва весці нястомную прафілактычную супроцьпажарную работу, узмоцнена ахоўваць нашы населеныя пункты ад пажараў.

С. Ажэрэльеў

## Сялянін — патрыёт

20 жніўня сялянін в. Харошча Вазнішчык Васіль выканаў даведзены яму план здачы хлеба на 100 проц.

У часць паспяховага заканчэння вайны з Японіяй т. Вазнішчык узяў абавязацельства здаць дзяржаве хлеба на 20 проц. звыш плана.

І Саломенік

## Папраўка

У артыкуле „Шырыць сацыялістычнае спаборніцтва на хлебанарыхтоўках", надрукаваным у № 33 нашай газеты ад 19 жніўня допушчаны цыфравыя памылкі аб ходзе нарыхтоўкі хлеба ў асобных сельсоветах.

На 18 жніўня процант выканання плана нарыхтоўкі хлеба складаў па Івацэвіцкаму пасялковаму совету 54 проц., Альбінскаму сельсовету—11 проц., Бусяжскаму—9, Косаўскаму горсовету—3 працанты.

## Ад Совецкага Інформбюро

### АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 19 ЖНІЎНЯ

У Маньчжуры войскі японскай Квантунскай арміі на большай частцы фронта спынілі супраціўленне і прадаўжаюць здавацца ў палон. Нашы войскі на гэтых участках фронта спынілі баявыя дзеянні супроць японскіх войск і прымаюць капітуліруючыя часці і злучэнні Квантунскай арміі.

Войскі 1-га ДАЛЁКАЎСХОДНЯГА ФРОНТА занялі гарады ВЭЙХЭ, ЯНЬЦЗІ. За 19 жніўня войскам фронта здалося ў палон 55.000 японскіх салдат і афіцэраў.

Войскі 2-га ДАЛЁКАЎСХОДНЯГА ФРОНТА занялі гарады МЭРГЭНЬ, ЛУНЧЖЭНЬ, САНЬСІН. За 19 жніўня войскам фронта здалося ў палон 23.000 японскіх салдат і афіцэраў.

Войскі ЗАБАЙКАЛЬСКАГА ФРОНТА занялі гарады ЖЭХЭ (ЧЭНДЭ), ЧЖАНЬУ, СІНЬМІНЬ, ЛЯСЮАНЬ, ЦЫЦЫКАР і знаходзіліся на подступах да гарадоў МУКДЭН, ЧАНЧУНЬ (СІНЬЦЗІН). За 19 жніўня войскам фронта здалося ў палон больш 20.000 японскіх салдат і афіцэраў.

Нашы авіядэсантныя групы, якія высадзіліся ў гарадах ХАРВІН, ГІРЫН, ЧАНЧУНЬ (СІНЬЦЗІН), МУКДЭН, даносяць, што японскія гарнізоны гэтых гарадоў гатовы здацца і чакаюць падыходу нашых войск.

Прыём капітуліруючых часцей і злучэнняў Квантунскай арміі прадаўжаецца.

СОВІНФОРМБЮРО.

Адказны рэдактар А. П. РУДАЯ.

Грамадзянін Кірыенка Еўгеній Паўлавіч, які пражывае ў гарадскім пасёлку Івацэвічы Косаўскага раёна, узбуджае ў Косаўскім нарсудзе справу аб разводзе з сваёй жонкай Кірыенка Верай Пракоф'еўнай, якая пражывае ў г. Пружаны, Пружанскага раёна, Брэсцкай області.

Справа будзе разглядацца ў нарсудзе Пружанскага раёна.

Нарсуд косаўскага раёна

Г Л 15281 Адрас рэдакцыі: Івацэвічы, вул. Шасейная 11.